УДК 7.046:75.045

# МІФАЛАГІЧНЫ СІМВАЛІЗМ У СУЧАСНЫМ МАСТАЦТВЕ

***А. В. Шаціло,*** *старшы выкладчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле раскрываецца сутнасць паняццяў сімвала і міфа, выяўляецца іх ўзаемасувязь, аналізуецца сімвалічная сістэма сучаснага мастацтва і разглядаецца разнастайнасць інтэрпрэтацый яе сэнсаў. Адзначана, што раскрыццё сімвалаў захоўвае ў міфалогіі вобразны характар і мае тэндэнцыю да бясконцых трансфармацый, а сам сімвал з'яўляецца формай міфалагічнага вобраза, увасабленнем міфа. Зроблена выснова, што па сутнасці ўсялякі сімвал ёсць інтэрпрэтацыя пэўных момантаў рэчаіснасці, прычым незалежна ад іх аб'ектыўнага існавання.

**Ключавыя словы:** міф, міфалогія, сімволіка, знак, мастацкі вобраз, сучаснае мастацтва.

# MYTHOLOGICAL SYMBOLISM IN CONTEMPORARY ART

***E. Shatilo,*** *Senior Lecturer of the Department of Decorative and Applied Arts of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article reveals the essence of the concepts of symbol and myth, reveals their relationship, analyzes the symbolic system of modern art and examines the variety of interpretations of its meanings. The author notes that the disclosure of symbols retains a figurative character in mythology and tends to endless transformations, and the symbol itself is a form of a mythological image, the personification of a myth. As a result, the author comes to the conclusion that, in fact, every symbol is an interpretation of certain moments of reality, regardless of their objective existence.

**Keywords:** myth, mythology, symbolism, symbol, artistic image, modern art.

Усеагульнасць распаўсюджвання сімвалаў у мастацтве цалкам абумоўлена сімвалічнай прыродай чалавечай культуры. Выкарыстанне сімвалаў у розных жыццёвых сітуацыях узмацняе суб'ектыўнае пачуццё бяспекі чалавека, калі сімвал выступае як уяўная замена невядомага, таямнічага. Тады ён мае знешняе канкрэтнае ўвасабленне і лягчэй успрымаецца чалавечай свядомасцю, чым нейкая абстрактная ідэя ці незразумелая з'ява. Сімвалы дапамагаюць уключаць самую незразумелую сітуацыю ў свет звычайнага вопыту, яны на пэўным узроўне злучаюць міфічную рэчаіснасць з рэальнай.

Раскрыццё сімвалаў захоўвае ў міфалогіі вобразны характар і мае тэндэнцыю да бясконцых трансфармацый. У аснове зместа міфалагічнага вобраза ляжыць некаторае асэнсаванне рэчаіснасці, якое атрымлівае

пэўнае сімвалічнае ўвасабленне ў творах мастацтва, а форма ўяўляе сабой выпрацаваны свядомасцю сімвал, які не трэба ствараць, ён ужо існуе ў межах вызначанай сістэмы культуры. Такім чынам, сімвал – форма міфалагічнага вобраза, увасабленне міфа.

Філасофска-эстэтычнае асэнсаванне сімвала ўпершыню ўзнікае ў антычнай культуры ў працах Платона і Арыстоцеля. Па сутнасці ўсе талкаванні сімволікі ў еўрапейскай культуры зыходзяць да іх прац, хоць яны і не змяшчаюць самога тэрміна «сімвал». Платон успрымаў сімвал як нейкае знакавае ўвасабленне вышэйшай сутнасці. Так, сімвалы трактуюцца як сутнасныя вобразы, разуменне і інтэрпрэтацыя якіх звязана з інтуіцыяй, іх сэнс дакладна не вызначаецца і не бывае аднолькавым.

Такім чынам, сімвалы дапамагаюць уключаць самую незразумелую сітуацыю ў свет звычайнага вопыту, яны на пэўным узроўні злучаюць міфічную рэчаіснасць з рэальнай – адбываецца сінхранізацыя часу і планаў быцця. Набыццё сімваламі шырокага кола значэнняў можна растлумачыць яго цеснай сувяззю з формамі асэнсавання Сусвету. Таму сімвал – і вынік развіцця чалавечай думкі, і сродак мастацкага засваення Сусвету. Д. Купер адзначае, што «сімволіка – старажытны фундаментальны метад выражэння рэальнасці, які здольны паказаць розныя яе аспекты, няўлоўныя для іншых сродкаў» [2, с. 5].

Даследчык М. Эліядэ лічыць, што таямніцы сімвалаў знаходзяцца ў глыбінях рэлігіі і псіхікі: «існуе нейкая логіка сімвала, некаторыя групы сімвалаў уяўляюцца злучанымі, лагічна звязанымі паміж сабою так, што можна гаварыць пра іх сістэматычна, пераводзіць на мову тэрмінаў» [4, с. 147].

Міф утрымлівае ў сабе пачатак многіх сімвалаў. Праз міфы і сімвалы чалавек спрабуе зразумець парадак, сістэму і сувязі гэтага свету. Свет тады становіцца не шэрагам аб’ектаў з незразумелай структурай і логікай узаемасувязей, а ладам, напоўненым сэнсам. Фарміраванне сімвалаў, нават містычных, мае сваёй асновай рэальныя з’явы і прадметы ў залежнасці ад іх разумення і інтэрпрэтацыі пэўнай супольнасцю людзей. Любыя рэчы і з’явы могуць стаць сімваламі, калі яны набудуць спецыфічнае значэнне – адлюстроўваць нешта асабліва значнае для чалавека.

Паводле Ю. Лотмана, сімвал – адзін з найбольш устойлівых элементаў культуры, які прыходзіць з мінулага, адыходзіць у будучае і захоўвае ў адзіным выглядзе вялікія тэксты [3].

Так, многае ў сімволіцы стала традыцыйным, што дазваляе праводзіць класіфікацыі, але сімвал нельга зводзіць да простага значэння і вызначэння, ён не можа быць чыстай формай.

Паняцце сімвала настолькі блізкае да такіх сумежных паняццяў, як «алегорыя», «метафара», «тып», «міф», «знак», што часам вельмі цяжка адрозніваць гэтыя сумежныя катэгорыі. Напрыклад, архетыпы

з'яўляюцца шматграннымі вобразамі, якія адлюстроўваюцца ў міфах і легендах, дзе і сімвалізуюцца. Пры гэтым адбываецца злучэнне сімвала і міфа, межы паміж імі знікаюць. Можна вылучыць непасрэднасць уздзеяння сімвалічных вобразаў на гледача і арганічнасць самой структуры сімвала. Тады паняцце сімвала можна трактаваць вельмі шырока: мова, міфы, рэлігія, мастацтва, навука ёсць сімвалічныя формы светабудовы.

Існуе шмат вызначэнняў сімвала, кожнае з якіх вызначае яго ў залежнасці ад канкрэтнага аспекту пэўнага даследавання. Сам тэрмін «сімвал» пры перакладзе на іншыя мовы застаецца нязменным і мае вельмі шырокае кола выкарыстання. Сімвал (грэч. συμβολον) – знак, апазнавальная прыкмета. Значная ўмоўнасць адносін сімвала да таго, што ён абазначае, дасягаецца вялікай ступенню абстракцыі. Сімвал ёсць адлюстраванне пэўнай рэчаіснасці, адначасова незалежна і ў залежнасці ад нашага суб'ектыўнага ўспрыняцця. Фарміраванне сімвалаў, нават містычных, мае сваёй асновай рэальныя з'явы і прадметы, у залежнасці ад іх разумення і інтэрпрэтацыі пэўнай супольнасцю людзей. Таму сімвал – гэта і вынік развіцця чалавечай думкі, і сродак мастацкага засваення Сусвету.

Сімволіка – пэўным чынам арганізаваная сістэма сімвалаў, якія маюць знешнюю і ўнутраную падпарадкаванасць. Гэта дазваляе разглядаць сімвал як феномен культуры, спецыфічную разумовую структуру, у якой змяшчаецца мноства сэнсавых рэчаіснасцей, сфарміраваных на аснове светапогляду папярэдніх культур і асіміляваных наступнымі. Такім чынам, сімволіка – гэта дынамічная сістэма, якая дазваляе чалавеку выйсці за абмежаваныя рамкі асэнсавання рэчаіснасці. Увогуле, сімвалы маюць непасрэдную сувязь з унутраным светам чалавека.

Сімвалічная сістэма мастацтва – сродак перадачы інфармацыі, але за сімваламі не замацавана аднаго дакладна вызначанага значэння, таму з яе дапамогай нельга бездакорна перадаць паведамленне, пры любой расшыфроўцы могуць адбывацца скажэнні тэксту іназірацца няправільная трактоўка. Пры любых абставінах сімволіка мастацтва непазбежна мае сэнс. Сімволіка мастацтва – гэта не сістэма пісьмовых знакаў, за кожным з якіх замацавана нейкае значэнне, таму з яе дапамогай нельга бездакорна дакладна перадаць інфармацыю, пры любой расшыфроўцы могуць адбывацца скажэнні тэксту і назірацца няправільная трактоўка. Напэўна таму шмат знакаў маюць вельмі шырокі спектр значэнняў. Напрыклад, адзін знак можа трактавацца як ураджай, багацце, пажаданне дабрабыту. Але агульнае сімвалічнае значэнне такіх знакаў звычайна складае нейкую сэнсавую сукупнасць. Нават у межах адной сістэмы можа існаваць іншая трактоўка сэнсу, якая мае гістарычную, рэлігійную, стылістычную залежнасць. Трэба ведаць, што абазначае знак асобна і якое значэнне, які сімвалічны вобраз знакі ствараюць у сістэме, у спалучэннях. Такім чынам, значэнне сімвала ў

межах мастацкага твора можа быць дакладна дэтэрмініраванае (адназначна прадказальнае); імавернае (статыстычна прадказальнае з зададзенай дакладнасцю); выпадковае (відавочна непрадказальнае).

Значэнне сімвала вызначаецца ўсім навакольным фонам, у пэўнай сістэме. У мастацтве сімвал можа ў часе і прасторы адначасова ці паслядоўна трансліравацца на бясконца вялікую колькасць фонаў (кантэкстаў), і ў кожным новым выпадку быць носьбітам рознага сэнсу. Тут паўстае праблема разумення сэнсу знака і сімвала, а потым яго асэнсаванага выкарыстання ў творах мастацтва ў межах той ці іншай традыцыі. Сімвалы і знакі даюць вельмі шмат магчымасцей для інтэрпрэтацыі яшчэ і таму, што адлюстроўваюць абстрактныя паняцці, адсюль непазбежна з'яўляюцца недакладнасць і шматзначнасць, якія робяць немагчымым існаванне толькі аднаго значэння.

Сэнс – шматаспектная катэгорыя, таму сімвал надзяляецца мноствамі сэнсаў, валодае комплексам значэнняў. Сэнсавая структура сімвала мнагапланавая і шматбаковая і разлічана на актыўнае ўспрыняцце суб'ектам. Аднак складанасць вызначэння сэнсу сімвала яшчэ і ў тым, што «трактоўка сімвалаў цесна звязана з асобай таго, хто спрабуе яго растлумачыць, яго свядомасцю, але ў першую чаргу з яго намерамі» [1, с. 11].

Сімвал з'яўляецца адносна ўстойлівым элементам культуры. У любым творы мастацтва пры дапамозе асацыяцый сэнс сімвала пашыраецца да актуальных ўяўленняў, які зразумелы для гледача. Пры гэтым сімвал валодае адаптацыйнымі рэзервамі для забеспячэння ўласнай варыятыўнасці ў памежных сітуацыях. Таму практычна немагчыма існаванне статычнага, дакладна і нерухома абазначанага сэнсу сімвала. Сімвал набывае новае значэнне або захоўвае старае зыходзячы з тых варыянтаў, якія ўжо раней існавалі ў межах вызначанай сімвалічнай сістэмы. Пры сутыкненні і адаптацыі розных культурных традыцый сэнс сімвала можа змяняцца ў рознай ступені, ад нюанснага да супроцьлеглага. Прычым найбольш архаічныя значэнні сімвала могуць існаваць разам з новымі і валодаць аднолькавай актуальнасцю. Сімвал заўсёды мае комплекс значэнняў, ён жыве, развіваецца, змяняецца. Часам цяжка вызначыць шляхі, якімі ён змяняе свае сэнсы, а часам усе яго трансфармацыі можна лагічна вылучыць адна з адной. Сімвал немагчыма дакладна зразумець па-за яго рэлігійным, культурным ці мастацкім кантэкстам. У мастацтве сімвал узнікае і функцыянуе як дынамічная катэгорыя, якая развіваецца ў працэсе творчасці. Усе працэсы трансфармацыі маюць прасторавы і часавы характар. Сімвалы здольны ўтвараць бясконца вялікую колькасць камбінацый. Такім чынам, значэнне (сэнс) сімвала вызначаецца толькі ў кантэксце, можа змяняцца ў часе, колькасць значэнняў імкнецца да бясконцасці.

Свядомасць чалавека асэнсоўвае навакольную рэальнасць і тым самым стварае «другасную» рэчаіснасць, аснову якой складаюць міфы і ўяўленні ў самым шырокім сэнсе слова, пры гэтым пэўным колерам,

вобразам, аб’ектам надаецца сімвалічны сэнс. Сімвалізм – складаная сістэма асэнсавання існасці са сваімі правіламі мадэлявання навакольнага свету, з-за чаго ён з’яўляецца неад’емнай прыналежнасцю кожнага твора. Любы твор змяшчае ў сябе ўнутраную логіку структуры і сэнсу. Стварэнне і раскрыццё сімвалаў захоўвае ў мастацтве вобразны характар і тэндэнцыю да бясконцых трансфармацый.

Сімволіка з’яўляецца вынікам свядомасці і мыслення, але ўжо аднойчы створаная, яна валодае аўтаномнасцю і незалежнасцю і трансфармуецца па правілах той сістэмы, дзе яна існуе. У сістэмах максімальна абстрактных унутрысістэмныя аперацыі па стварэнню новых сімвалаў і знакаў ці іх складаных спалучэнняў з’яўляюцца больш свабоднымі.

Так, можна сказаць, што сімвал з’явіўся заканамерным вынікам асэнсавання Сусвету старажытным чалавекам. Па сутнасці ўсялякі сімвал ёсць інтэрпрэтацыя пэўных момантаў рэчаіснасці, прычым незалежна ад іх аб’ектыўнага існавання. У сімвале першапачаткова закладзена магчымасць успрымаць, захоўваць і перадаваць пэўны аб’ём інфармацыі ў прасторы (у межах вызначанага гістарычнага перыяду) і ў часе (праз лінейнасць часу з мінулага ў будучыню). У сімволіцы мастацтва мы бачым як статычныя, традыцыйныя вобразы, так і сучасныя інтэрпрытацыі і спосабы іх увасаблення. Прычым іх устойлівасць вызначаецца і адлічваецца стагоддзямі, а разам з гэтым яна можа імаверна трансфармавацца. Сімвалізм у сваёй структуры з’яўляецца агульным прынцыпам, мадэллю для бясконцых пераўвасабленняў, варыянтаў у межах вызначанага часу.

1. *Бауэр, В.* Энциклопедия символов / В. Бауэр, И. Дюмотц, С. Головин ; пер. с нем. Г. Гаева. – М. : Крон-Пресс, 2000. – 504 с.

2. *Купер, Д.* Энциклопедия символов : пер. / Д. Купер. – М. : Ассоц. духов. единения «Золотой Век», 1995. – 401 с. – (Серия «Символы» ; кн. 4).

3. *Лотман, Ю. М.* Внутри мыслящих миров. Человек – текст – семиосфера – история / Ю. М. Лотман. – М. : Языки русской культуры, 1996. – 464 с.

4. *Элиаде, М.* Аспекты мифа : пер. с фр. / М. Элиаде. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Академ. проект, 2001. – 240 с.